студзень, 2010

# ГОРАД НАШ

Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы“

# Нашей “ВИКТОРИИ” 10 лет!

Женская сборная по хоккею на траве «Виктория» образовалась 14 января 2000г, спустя 7 лет, как открылся вид спорта в ДЮСШ г. Смолевичи. С 1996г. клуб выступал на Чемпионате РБ под названием «Колос» Смолевичи до 1999г., а с 2000г. ХК «Виктория» Мин.обл.

Каграманян Самвел Григорич МС СССР, главный тренер молодёжной сборной РБ с 2000г., гл. ренер национальной сборной с 2009г., основатель хоккея на траве в Минской области 1993г. г. Смолевичи. Аналога такого клуба нет в РБ. Команда высокого Европейского уровня. На сегодняшний день входит в пятерку лучших команд Европы 2007 г. Попали по рейтингу в Евролигу по хоккею на траве из 24 клубов Европы. Остальные 32 клуба Европы остались в отборочном турнире. Около 18 спортсменов попаливсборную РБ ( 5 чел. В национальную, 8 в молодежную, 5 в юношескую).



За время существования клуба под-готовлено более 27 мастеров спорта РБ. 3 мастера спорта международного класса и более 50 кандидатов в мастера спорта, 65 первых разрядов.

Впервые за 29 лет в Беларуси Молодежная сборная страны играла в 2005 году в финале Чемпионата Мира состоящих из 117 сильнейших стран, наши попали в 16 лучших и заняли 14 место под руководством главного тренера Молодежной сборной РБ Каграманян С.Г.

Молодежная сборная является трехкратным чемпионом Европы и двух кратным серебряным призером Европы по индорхоккею с 2000 по 2007г.

Цель хоккейного клуба – развитие и популяризация х/т в Минской области и РБ на Международной арене.

его численность 150 человек и более, 2 тренера+тренер-массажист, тренер – врач. Хоккейный клуб «Виктория» участвует в соревнования республиканского и международного уровня.

Список наград:

- Чемпионат Европы 2001г. – 1 место (индорхоккей)
- • Республиканская спартакиада среди ДЮСШ 2002г. - 1 место
- Республиканские ОДМ 2002г. – 1 место
- Чемпионат РБ 2003г. - 1 место
- Чемпионат РБ 2003г. – 1 место (индорхоккей)
- • Республиканские ОДМ 2003г. – 1 место
- Республиканские ОДМ 2004 г. - 1 место
- РСС ДЮСШ 2004г. - 1 место
- Международный турнир «Подмосковные вечера» 2004г. - 2 место (индорхоккей)
- Чемпионат Европы 2005г. - 1 место
- Чемпионат РБ индорхоккей 2005г. - 1 место
- Кубок Кубков Европейских стран Австрия-Вена 2005г. - 1 место
- Чемпионат РБ 2005г. -2 место
- РСС ДЮСШ 2005г. – 1 место
- Международный турнир Литва 2005г. -1 место
- Международный турнир « Кубок Содружества» г. Сумы Украина 1 место

и др.

**“Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае выказванне іх; гэта права ўключае свабоду бесперашкодна прытрымліваца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных граніц.“**

**Арт. 19** (усеагульная дэкларацыя правоў чалавека)

# Партыя БНФ фармуе ініцыятыўную групу для рэферэндуму супраць павышэння мытаў на аўто

***Пра гэта было заяўлена 16 студзеня ў Мінску на паседжэнні сойму партыі.***

Як паведаміў намеснік старшыні партыі Ігар Лялькоў, у ініцыятыўную групу павінна ўвайсці як мінімум тысяча чалавек. Ён падкрэсліў, што гэта павінны быць «не ангажаваныя асобы, а тыя, каго непасрэдна закранае дадзеная праблема».



Папярэдняя дата правядзення сходу ініцыятыўнай групы — 28 лютага.

Упершыню ініцыятыва правядзення рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні павышэння мытнай пошліны на аўтамабілі была агучана Партыяй БНФ у снежні мінулага года.

У кіраўніцтве партыі мяркуюць, што пагадненне аб стварэнні Мытнага саюза, падпісанае 27 лістапада ў Мінску кіраўнікамі Беларусі, Казахстана і Расіі, «ігнаруе інтарэсы значнай часткі грамадзян Беларусі, для якіх уступленне ў сілу падпісаных дакументаў можа пацягнуць пагаршэнне асабістага матэрыяльнага дабрабыту ў сувязі са значным павышэннем мытных тарыфаў і, адпаведна, цэн на важныя катэгорыі тавараў, у прыватнасці на легкавыя аўтамабілі».

У Партыі БНФ таксама ўпэўнены, што стварэнне Мытнага саюза ігнаруе інтарэсы беларускага малога і сярэдняга бізнесу.

Фарміраванне ініцыятыўнай групы па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму плануецца завяршыць да 1 сакавіка.

Прадугледжваецца, што ў групу ўвойдуць у тым ліку прадстаўнікі Партыі БНФ, якія будуць вылучацца кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых саветаў.

***

Варта зазначыць, што аўтамабілі з’яўляюцца адной з асноўных таварных пазіцый, па якой для Беларусі адбылося найбольш значнае павышэнне пошлін у межах Мытнага саюза.

Пакуль павышэнне закранула юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў: з новага года пошліны даведзены да ўзроўню расійскіх. На некаторыя імпартныя аўтамабілі стаўкі пошлін павялічыліся ў 10 разоў.

Для фізічных асоб у межах Мытнага саюза новыя правілы ўвозу аўтамабіляў пакуль не вызначаны. 14 студзеня кіраўнік Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі паведаміў журналістам, што дзейныя правілы ўвозу аўтамабіляў фізічнымі асобамі застануцца ранейшымі да ліпеня. З 1 ліпеня 2010 года, калі ў поўным аб’ёме запрацуе Мытны саюз Беларусі, Казахстана і Расіі, пошліны на ўвоз транспартных сродкаў фізасобамі ўзрастуць.

*БелаПАН*

# *Фотаконкурс “Твае Смалявічы праз аб’ектыў фотакамеры” завяршыўся*

**27 снежня Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы” і першы партал горада Смалявічы www. Smaliavichy.by падвялі вынікі трэцяга заключнага тура фотаконкурсу “Твае Смалявічы праз аб’ектыў фотакамеры” у незвычайным фармаце. Атмасфэру свята вы можаце ацаніць па фотаздымкам на партале Smaliavichy.by.**

Пераможцаў гэтага тура вызначаў беларускі фатограф Юрый Федарэнка www.fedorenkophoto. com. Работы Юрыя вам вядомы па білбордам Velcom, МТС, Life, Атлант М і інш. буйных кампаній. З яго працамі вы можаце азнаёміцца на сайце www.fedorenkophoto.com.

Такім чынам, фотаконкурс “Твае Смалявічы праз аб’ектыў фотакамеры” завяршыўся. Ён праходзіў у 2009 годзе ў тры тура. Мэта фотаконкурсу была паказаць усю прыгажосць Смалявіцкага краю і даказаць, што наш горад – не глыбінка, а вельмі самабытны і незвычайны. Удзел у ім прынялі каля 40 чалавек, але пераможцамі сталі: Аня Захлябаева, Тацццяна Дзем’яновіч, Максім Галадзюк, Дзяніс Галушка, Ягор Драгун, Аня Ліхтаровіч, Аляксей Даўжэнка.

Тацццяна Дзем’яновіч і Максім Галадзюк былі пераможцамі двойчы, і за сваю актыўнасць і талент атрымалі дадатковы падарунак ад грамадскай ініцыятывы “За Новыя Смалявічы.”

Наша ініцыятыва вельмі радая таму, што змагла фотаконкурсам стварыць нешта карыснае для гараджан і Смалявічаў. Таксама нам было вельмі прыемна даведацца, што і газэта Смалявіцкага выканкама “Край Смалявіцкі” абвясціла аб правядзенні падобнага фотаконкурса з назвай “Свет праз аб’ектыў”, які таксама будзе арганізаваны ў тры тура ў 2010 годзе.

*****

Мы зноў вырашылі арганізаваць падвядзенне вынікаў фотаконкурсу ў арыгінальным і незвычайным фарце. Наша тусоўка сабралася па-за межамі горада на прыродзе, каб паўдзельнічаць разам у арыентыршоў і вяровачным курсе.

Арыентыршоў дапамог арганізаваць актыўны трэнер, турыст і падарожнік нашага горада Дзяніс Галушка. Мы разбіліся на 5 каманд для таго, каб выканаць заданні: адшукаць у лесе кавалачак мапы. Калі каманда збірае поўную мапу, то на адваротным баку прачытваецца мудрасць ад славутых землякоў нашага краю. Хто першы “пазнае” гэтую мудрасць становіцца пераможцам. Арыентыршоў, свежае паветра і спаборніцтва адразу падбадзёрыла і зрабіла пачатак свята вясёлым.

З пераможцаў арыентыршоў мы зрабілі дзьве каманды для вяровачнага курса. Вяровачны курс – гэта актыўны трэнінг і спаборніцтва для развіцця майстэрства працаваць у камандах. Гэта праграма распрацавана амерыканскай фірмай Barron Adventures. Падчас выканання курсу ствараецца атмасфера творчага пошуку, прапрацоўваюцца магчымасці прыняцця нестандартных рашэнняў, павялічваецца ўзаемадапамога і падтрымка ў калектыве. «Вяровачны курс – гэта праграма ўзаемаадукацыі, у якой удзельнікі спазнаюць усе самі з уласнага досведу, паводле сваіх дзеянняў. Галоўныя мэты «вяровачанага курсу» – камандная праца і лідарства.

Пасля актыўных спаборніцтваў пачалася прыемная частка падзеі – падарункі і музыка. І зноў падарункі атрымалі ўсе ўдзельнікі фотаконкурсу. А музыка была асаблівая. Выканаў песні на вершы беларускіх паэтаў краязнаўца і бард Аляксей Галіч. Аляксей у пачатку распавёў гістарычныя факты, звязаныя са Смалявіччынай і яе славутымі землякамі. Яго погляд зацікавіў нават тых, хто ўжо неаднаразова чуў пра гэта.

А пасля навагодні сюрпрыз прапанаваў нам Дзмітрый – студэнт Педагагічнага універсітэта. Ён прадставіў нам калядную батлейку. Яна ўразіла кожнага з прысутных. Не кожны дзень такое ўбачыш!

Мы ўдзячны ўсім, хто дапамог арганізаваць гэта свята! А таксама – ўсім удзельнікам фотаконкурса за іх жаданне паказаць усю прыгажосць нашага краю! Заставайцеся і далей творчымі і ініцыятыўнымі – хай з Вамі заўжды крочыць перамога і поспех!

Калі вы маеце свае фотаздымкі і жадаеце, каб іх убачылі іншыя, а таксама жадаеце, каб вашыя фотаздымкі трапілі ў каляндар на 2011 год – абавязкова дасылайце іх на адрэсу goradnasz@gmail.com увесь наступны год ці дадавайце наўпрост на партал.




***По выніках фотаконкурса Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы” і першы партал горада www.Smaliavichy.by з фотаздымкаў пераможцаў трох тураў выдалі каляндар на 2010 год.***

## Редакция интернет-портала «Борисов Электронный» объявляет журналистский конкурс

Информационный портал «Борисов Электронный» объявляет конкурс материалов на лучшее освещение событий в Борисовском, Жодинском, Березинском и Смолевичском регионах. Участие в конкурсе могут принять старшеклассники, учащиеся профессиональных учебных заведений – все, кто интересуется журналистикой.

Конкурсанты получат возможность вступить в молодежный клуб, получить доступ в Интернет, изучить основы журналистики, подготовиться к поступлению на факультеты журналистики. Победителей конкурса ждут призы.

**Контакты:** *тел. 8-029-756-35-24 (МТС), 8-029-658-54-51 (Велком),*
**e-mail – Ot_l@bk.ru**

**Борисов Электронный**

***“Паважаныя чытачы, калі вам падабаецца наш бюлетэнь “Торад Наш”, і вы жадаеце нам дапамагчы, перадайце пачытаць яго сваім сябрам, сваякам, знаёмым ці суседзям.***

## Контрактная система – лучшее средство борьбы с неугодными работниками

***Суд города Жодино (председатель Алина Клус) на своем заседании 4 января отказался восстановить на работе активиста независимого профсоюза РЭП бригадира, грузчиков Белорусского автомобильного завода (РУП БелАЗ) Юрия Лобана. С ним не был продлен пятилетний контракт, несмотря на отсутствие замечаний и наличие благодарностей, которые бригада под его руководством получала от администрации предприятия.***

Под зоркое око заводских идеологов Лобан попал в середине прошлого года. Вот что, в частности, заявил по этому поводу заместитель генерального директора по идеологической и информационной работе предприятия Станислав Якубович в интервью интернет-порталу «Солидарность»:

«– Где-то полгода назад на заводе были распространены листовки политического характера. Начали разбираться. У нас система налажена четко. Доложили его фамилию. Он распространял, и еще один человек. У нас в колдоговоре записано: «На территории предприятия запрещается всякая политическая деятельность». Это, конечно не связано с этим (увольнением – «С»). Но, я понимаю так, зачем человек куда-то стремится? Пришел бы и открыто сказал: «Я недоволен». А тут все исподтишка делает».

В итоге с Лобаном не продлили контракт, несмотря на то, что он в данное время является единственным кормильцем трехлетней дочери, и это в очередной раз подтвердило очевидную истину: контрактная система – лучшее средство борьбы руководства с неугодными работниками.

Как сообщил нам представитель профсоюза РЭП по Минской области Николай Похабов, юристы профсоюза готовят кассационную жалобу в Минский областной суд. Характерно, что во время оглашения решения суда об отказе в восстановлении Лобана на работе председатель суда Алина Клус объявила о том, что подготовит частное определение в адрес администрации РУП БелАЗ в связи с фактами нарушения трудового законодательства на предприятии.

***Борисов Электронный***

*Галоўны рэдактар:* Яўген Смалявіцкі
*Мастацкі рэдактар:* Зорачка

*Распаўсюджваецца:* Бясплатна
*Тыраж:* 299 асобнікаў
*Выдавец і заснавальнік:* Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы“

*Адваротная сувязь:*
*тэл. +375 29-994-22-81*
*goradnasz@gmail.com.*
*www.Smaliavichy.by*